Опыт показывает, что использование белорусских народных колыбельных, потешек, закличек, считалок, пение народных песен, исполнение хороводов, плясок, музицирование, эффективно в патриотическом воспитании дошкольников, если:

- восприятие фольклорной музыки детьми дошкольного возраста в процессе слушания, пения, исполнения, самовыражения в музыкальных импровизациях белорусской народной музыки осуществляется на основе учета индивидуальных и возрастных особенностей воспитанников;
- ознакомление с белорусским музыкальным фольклором в процессе слушания, пения, исполнения, самовыражения в музыкальных импровизациях народной фольклорной музыки проводится в системе, в интеграции всех образовательных областей;
- основой содержания деятельности является нравственный компонент, направленный на патриотическое воспитание посредством музыкального фольклора;
- процесс ознакомления с белорусским музыкальным фольклором организован в комплексе специально организованной и нерегламентированной деятельности.

Таким образом, ознакомление с белорусском музыкальным фольклором способствует воспитанию, уважения к прошлому своего народа, изучению его традиций, усвоению морально-нравственных норм поведения в обществе, любви к своей Родине.

**Список использованных источников:**

1. Учебная программа дошкольного образования (для учреждений дошкольного образования с русским языком обучения и воспитания). – Минск : Национальный институт образования, 2019. – 479 с.

## ФІЛАСОФСКІЯ І ПСІХАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ ФАРМІРАВАННЯ КУЛЬТУРЫ ЎСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ

*Комлік М. А.,*
*ДУА «Каладзішчанская сярэдняя школа» Мінскага раёна,*
*Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца асаблівасці фарміравання культуры ўстойлівага развіцця з пункту гледжання тэорыі аб наасферы, іерархіі патрэб чалавека і халістычнай адукацыі. Звяртаецца ўвага на неабходнасць узбагачэння міждысцыплінарнага і шматаспектнага падыходу да развіцця асобы, якая будзе падрыхтавана да сутыкнення з выклікамі сучаснасці, а таксама гарманічнага суіснавання з навакольным светам.

**Resume.** The article examines the features of the formation of a culture of sustainable development in terms of the theory of the noosphere, the hierarchy of human needs and holistic education. Attention is drawn to the need to enrich the interdisciplinary and multifaceted approach to personal development, which will be prepared to face the challenges of today, as well as harmonious coexistence with the outside world.

**Ключавыя словы:** адукацыя, устойлівае развіццё, наасфера, шматдысцыплінарны падыход, халістычная адукацыя.

**Key words:** education, sustainable development, noosphere, multidisciplinary approach, holistic education.

Адным з аб’ектаў вывучэння філасофіі, які да нашага часу выклікае спрэчкі ў навуковых і грамадскіх колах, з’яўляецца пытанне: быццё вызначае свядомасць ці свядомасць вызначае быццё?

У кантэксце сферы адукацыі яно набывае асаблівае значэнне. Што становіцца вырашальным у працэсе развіцця асобы: асяроддзе, у якім дзіця набывае веды, пазнае свет, які фарміруе яго светаўспрыманне, свядомасць, характар, ці сам індывід, які аналізуе бязмежнае мноства крыніц інфармацыі і выбірае, што будзе аказваць уплыў на фарміраванне яго індывідуальнасці і, як канчатковы вынік, асобы. Таксама паўстае пытанне, якім чынам фарміруецца сам механізм ацэнкі і аналізу, што і на якіх этапах развіцця дзіця патрэбна зрабіць, каб у будучыні яно валодала свядомасцю, падрыхтаванай да вырашэння рознага кшталту жыццёвых задач, магло аб’ектыўна ацэньваць рэчаіснасць і сябе ў гэтай рэчаіснасці, ствараючы ўласнае быццё, якое ў вялікай ступені ўплывае на быццё яго асяроддзя і грамадства ў цэлым.

На наш погляд, гэта пытанне неабходна разглядаць з філасофскага і псіхалагічнага пункту гледжання адначасова. У артыкуле «Адукацыя ў кантэксце канцэпцыі ўстойлівага развіцця» даследчыкі Н.Д.Гуськова, А.А.Нярэціна, Т.А.Салімава звяртаюць увагу на тое, што «ідэя неабходнасці ўстойлівага развіцця ўзнікла на аснове тэорыі наасферы» [1]. Так, паняцце наасферы ўключае ў сябе два кампаненты (наа – розум, сфера – абалонка Зямлі) і ў першую чаргу накіравана на захаванне прыродных рэсурсаў. Тэарэтыкі наасфернага вучэння на розных этапах развіцця даследаванняў укладалі ў паняцце наасферы розны сэнс. Э. Леруа і П. Т. Шардэн лічылі, што пад неасферай неабходна разумець абалонку, якая фарміруецца чалавечай свядомасцю. На думку В. І. Вярнадскага, наасфера – матэрыяльная абалонка Зямлі, якая змяняецца пад уздзеяннем людзей, якія сваёй дзейнасцю так пераўтвараюць планету, што могуць быць прыняты за моцную геалагічную сілу. Так дадзеная сіла, кіруючыся думкай і працай, перабудоўвае біясферу на карысць чалавека, які свабодна разважае, як адзінага цэлага з навакольным асяроддзем [2]. Каб уздзеянне чалавека на біясферу атрымлівала станоўчыя вынікі, сам суб’ект уздзеяння павінны дасягнуць такога ўзроўню развіцця, пры якім асноўнай мэтай яго дзейнасці становіцца самавыяўленне і імкненне да пабудовы гарманічнага асяроддзя, што, у сваю чаргу, патрабуе задавальнення ўсіх патрэб асобы.

Згодна з канцэпцыяй амерыканскага псіхолага А. Маслоу, іерархія патрэб чалавека можа быць прадстаўлена сямю блокамі: фізіялагічныя патрэбы, патрэба ў бяспецы, патрэба ў прыналежнасці і любові, патрэба ў павазе (шанаванні), пазнавальныя патрэбы, эстэтычныя патрэбы і патрэба ў самаактуалізацыі. На думку даследчыка, толькі задавальненне кожнай папярэдняй патрэбы дазваляе задаволіць наступную [3].

Назіраецца сугучнасць дадзенай канцэпцыі з 17 мэтамі ў галіне ўстойлівага развіцця, сфармуляванымі ААН, сярод якіх: ліквідацыя галечы, голаду, памяншэнне няроўнасці, паляпшэнне стану гарадоў і населеных пунктаў, даступнасць адукацыйных рэсурсаў для ўсяго насельніцтва, магчымасць кар’ернага росту, паляпшэння эканамічнага стану асобы, а таксама захаванне прыродных рэсурсаў [4]. На нашу думку, даступнасць адукацыі ўскосна ўплывае на рэалізацыю астатніх мэтаў, бо фарміраванне асобы, якая гарманічна суіснуе з навакольным асяроддзем, дапаўняе і ўдасканальвае яго, з’яўляецца вынікам паспяховага засваення, аналізу і самастойнай сістэматызацыі ведаў з розных сфер чалавечай дзейнасці. Акрамя таго, асаблівая ўвага адукацыйнай сістэмы павінна быць звернута на раскрыццё здольнасцей кожнага асобнага чалавека, вывучэнне асяроддзя павінна пачынацца з вывучэння індывідам самога сябе, каб усе знешнія працэсы ацэньваліся асобай, якая дакладна разумее, кім яна з’яўляецца. Вывучэнне самога сябе, магчыма, нават у большай меры, чым вывучэнне рэчаіснасці, патрабуе рознабаковага развіцця, што павінна знаходзіць сваё адлюстраванне ў сучаснай сістэме адукацыі. У сувязі з гэтым, у «Павестцы дня на XXI стагоддзе», якая была прынята на Канферэнцыі ААН па навакольным асяроддзі і развіццю (3–14 чэрвеня 1992, Рыа-дэ-Жанейра) у главе 36 «Садзейнічанне асвеце, інфармаванню насельніцтва і падрыхтоўцы кадраў», звяртаецца ўвага на тое, што «неабходна правесці дасканалы аналіз вучэбных праграм у мэтах забеспячэння шматдысцыплінарнага падыходу з улікам пытанняў навакольнага асяроддзя і развіцця і іх сацыяльна-культурных і дэмаграфічных аспектаў і сувязей» [5].

Асаблівасці шматдысцыплінарнага падыходу як аднаго з аспектаў фарміравання культуры ўстойлівага развіцця падрабязна разглядаюцца ў межах канцэпцыі халістычнай адукацыі. Канадскі педагог Дж. Мілер у кнізе «Халістычная адукацыя. Педагогіка прадчування» дае наступнае азначэнне тэрміну «халістычны»: «Слова «халістычны» ўтворана ад грэчаскага «holon» і азначае «Сусвет як цэлае», тое, што не дзеліцца на часткі» [6]. Згодна з дадзеным тлумачэннем, халістычная (цэласная) адукацыя імкнецца «пабудаваць навучанне ў адпаведнасці з законамі прыроды, дзе ўсё ўзаемазвязана і зменліва. Мы можам назіраць гэта ў атаме, у клетцы, у біясферы і ва ўсім Сусвеце» [6]. У сваім даследаванні аўтар звяртае ўвагу на тое, што сучасны свет адчувае востры недахоп цэльнасці, і гэта знаходзіць сваё адлюстраванне ва ўсіх палітычных, сацыяльных, эканамічных, культурных і духоўных працэсах. Акрамя таго, даследчык уздымае пытанне адсутнасці сфарміраванай адзінай сістэмы каштоўнасцей, якая б была актуальна для кожнай асобы, што з'яўляецца адным з фактараў не толькі раздзялення людзей, але і ўнутранага разладу чалавека: «Мы калекцыяніруем мноства рэчаў. Але многія людзі, якія дасягнулі матэрыяльнага дастатку, не адчуваюць паўнаты існавання. Ім усё роўна чагосьці не хапае. І гэта «штосьці» за адсутнасцю лепшага азначэння мы называем духоўнасцю. Пад гэтым словам мы маем на ўвазе пачуццё глыбокай пашаны да жыцця, якое ўзнікае ад прыналежнасці да чагосьці адначасова прыгожага і таямнічага» [6]. Даследчык падкрэслівае, што, як наша жыццё, так і наша адукацыя аказваюцца «разарванымі»: «Мы раздзялілі веды на прадметы, тэмы і ўрокі. Вучні вельмі часта не бачаць сувязі паміж імі, а таксама паміж школай і жыццём» [6]. Дж. Мілер бачыць у звароце да халістычнай адукацыі магчымасць выйсця з сітуацыі ўсеагульнага непаразумення, бо «халістычная адукацыя трымаецца на трох кітах: раўнавазе, уключанасці кожнага і сувязі» [6], што забяспечвае паўнавартаснае развіццё асобы.

Такім чынам, сучасная сістэма адукацыі патрабуе ўключэння ў адукацыйныя праграмы заданняў, накіраваных на фарміраванне ў навучэнцаў цэласнай карціны свету, што можа быць рэалізавана, напрыклад, праз правядзенне міждысцыплінарных урокаў, на якіх адна і тая ж з'ява даследуецца з пункту гледжання розных навук. Акрамя таго, асаблівай увагі патрабуе развіццё індывідуальных, унікальных якасцей навучэнцаў, іх творчых здольнасцей, культуры ўзаемаадносін з іншымі людзьмі, удасканальванне маральных і духоўных арыентыраў асобы. Неабходна адзначыць, што ўстойлівае развіццё грамадства – гэта працэс дасягнення гармоніі ва ўсіх сферах дзейнасці чалавека, для паспяховай рэалізацыі якога патрабуецца ўклад кожнай асобы.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Гуськова, Н. Д. Образование в контексте концепции устойчивого развития [Электронны рэсурс] / Н. Д. Гуськова // Образование и педагогические науки. – Режим доступа : file:///C:/Users/Work/Desktop/%D0%A8%D0%BA%D0%BE%D0%BB%D0%B0/%D0%A3%D0%9E%D0%A0/obrazovanie-v-kontekste-kontseptsii-ustoychivogo-razvitiya.pdf. – Дата доступа : 25.04.2022.

2. Вернадский, В. И. Химическое строение биосферы Земли и ее окружения / В. И. Вернадский. – М.: Наука, 2001. – 376 с.

3. Маслоу, А. Х. Мотивация и личность [Электронный ресурс] / А. Х. Маслоу. – Режим доступа : http://loveread.ec/view_global.php?id=49550. – Дата доступа : 28.04.2022.

4. Цели в области устойчивого развития [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.un.org/sustainabledevelopment/ru/sustainable-development-goals/. – Дата доступа: 29.04.2022.

5. Повестка дня на XXI век [Электронный ресурс] // ООН: конвенции и соглашения. – Режим доступа : https://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/agenda21.shtml. – Дата доступа : 30.04.2022.

6. Миллер, Дж. Холистическое образование. Педагогика предчувствия [Электронный ресурс] / Дж. Миллер. – Режим доступа : https://inlnk.ru/3ZxRAz. – Дата доступа : 25.04.2022.

## ПОДХОД СЕМАНТИКИ СОБЫТИЯ К ФОРМИРОВАНИЮ МУЛЬТИКУЛЬТУРНОГО СОСУЩЕСТВОВАНИЯ

*Луань Ин,*
*Белорусский государственный университет,*
*г. Минск, Республика Беларусь*

**Аннотация.** В статье представлен подход к формированию культуры устойчивого развития с точки зрения семантики события. Данное исследование предлагает мнение построения мультикультурного сосуществования в рамках Неодавидсоновской парадигмы семантики события, которая способствует раскрыть разные мышления людей разных языков.

**Resume**. The article presents an approach to establish the culture of sustainable development from the perspective of event semantics. The research proposes that establishing the multicultural coexistence in the framework of Neo-Davidsonian paradigm of event semantics helps reveal different thinking modes of people of different languages.

**Ключевые слова:** культура устойчивого развития; мультикультурное сосуществование; Неодавидсоновская парадигма семантики события; мышление людей.

**Key words:** culture of sustainable development; multicultural coexistence; Neo-Davidsonian paradigm of event semantics; thinking modes.

Культура устойчивого развития является результатом адаптации жизнедеятельности людей и формирования новых мировоззрений в современном обществе. На юбилейной конференции ООН в 2012 г. обсуждалась приоритетность культуры при переходе к устойчивому развитию, и контуры «желаемого будущего» отмечаются для необходимого изменения культуры современного общества.

В своей работе «Исторический процесс и концепция устойчивого развития» Н.М.Мамедов утверждает, что культура устойчивого развития становится способом гармоничного соединения человека и природы на основе её глубоко познания и понимания [1]. Ценность культуры устойчивого развития в современном обществе мотивирует ученых найти подходы к ее формированию. Среди работ исследователей можно выделить следующие: М.В. Тлостановы «Постсоветская литература и эстетика транскультурации. Жить никогда, писать ниоткуда» [2], Ю.В. Стулова «Американский литературный канон в эпоху мультикультурализма» [3], Ч. Кукатаса «Теоретические основы мультикультурализма» [4], Х.Ян «Мультикультурализм и гармоническое сосуществование» [5], Д.Юэ «Мультикультурализм и развитие сравнительной литературы» [6]. Среди выполненных работ, исследования мультикультурализма находится видно в поле межкультурной коммуникации и множественности культурных традиций в литературе, хотя по мнению М.В. Тлостановы, мультикультурализм сначала рассматривается достаточно новым понятием для восточноевропейской литературной критики и культурологии [2].

Известно, что важнейшей чертой мультикультуралистического общества является параллельное существование различных культур. Для мультикультурализма необходимо построить взаимопонимания и эффективные общения между носителями разных языков. Лингвистика, в частности семантика, способствует развитию мышления людей, говорящих